# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

4 студзеня 2018 г. № 1 г.Мінск

Аб прысуджэнні прэміі Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь

1. За актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, што садзейнічае захаванню і памнажэнню нацыянальнага культурнага здабытку, выхаванню ў моладзі любові да Айчыны, умацаванню духоўных каштоўнасцей і міласэрнасці, прысудзіць прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”За духоўнае адраджэнне“ 2017 года:

грамадскаму аб’яднанню ”Беларускі саюз жанчын“ – за плённую працу па ўмацаванні інстытута сям’і, ахове мацярынства і дзяцінства, актыўную дабрачынную дзейнасць;

калектыву дзяржаўнай установы ”Нацыянальная бібліятэка Беларусі“ – за работу па факсімільным узнаўленні і папулярызацыі кніжнай спадчыны Францыска Скарыны;

калектыву дзяржаўнай установы ”Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М.Аляксандрава“ – за значны ўклад ва ўмацаванне ідэй чалавекалюбства, дабрачыннасці і міласэрнасці;

протаіерэю Віктару Георгіевічу Перагудаву, настаяцелю прыхода храма прападобнай Еўфрасінні Полацкай у г.п.Івянец Валожынскага раёна Мінскай вобласці, – за заслугі ў арганізацыі сацыяльнай дапамогі дзецям-інвалідам і іншым катэгорыям грамадзян;

Шабановічу Абу-Бекіру Юхьянавічу, муфтыю рэспубліканскага рэлігійнага аб’яднання ”Мусульманскае рэлігійнае аб’яднанне ў Рэспубліцы Беларусь“, – за значны асабісты ўклад у захаванне духоўных каштоўнасцей і традыцый мусульман Беларусі.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”За духоўнае адраджэнне“ 2017 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь — А.Лукашэнка

Для
правовых
актов

10